# ПЛЕНАРНЫЕ ДОКЛАДЫ

## ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА: ПАДЗЕІ І ЛЮДЗІ ВА ЎДЗЯЧНАЙ ПАМЯЦІ ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СТУДЭНТАЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

**А. А. Яноўскі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, helgoleg@mail.ru*

Сістэматызаваны шматлікія прыклады захавання памяці аб выкладчыках і студэнтах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта — удзельніках Вялікай Айчыннай вайны — у штодзённай яго дзейнасці 1950–2025 гг. Звяртаецца ўвага на тое, што за пасляваенныя амаль што 80 гадоў у БДУ надрукавана дастаткова вялікая колькасць кніг і артыкалаў аб інтэлектуальных прашчурах — тых, хто змагаўся з ворагам са зброяў у руках ці прыбліжаў перамогу, працуючы ў савецкім тыле ў якасці выкладчыкаў і навукоўцаў. Адначасова заўважана неабходнасць актывізацыі збору матэрыялаў па ўвекавечванню памяці аб кожным удзельніку вайны — выкладчыку, супрацоўніку, студэнту БДУ.

***Ключавыя словы:*** памяць; Вялікая Айчынная вайна; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; выкладчыкі; студэнты.

## ВЕЛИКАЯ ОТЕЧЕСТВЕННАЯ ВОЙНА: СОБЫТИЯ И ЛЮДИ В БЛАГОДАРНОЙ ПАМЯТИ ПРЕПОДАВАТЕЛЕЙ И СТУДЕНТОВ БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА

**А. А. Яновский**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, helgoleg@mail.ru*

Систематизированы многочисленные примеры сохранения памяти о преподавателях и студентах Белорусского государственного университета — участниках Великой Отечественной войны — в его повседневной деятельности с 1950 по 2025 г. Обращает на себя внимание тот факт, что за почти 80 послевоенных лет БГУ опубликовал довольно большое количество книг и статей об интеллектуальных предках — тех, кто с оружием в руках сражался с врагом или приближал победу, работая в советском тылу в качестве преподавателей и ученых. При этом отмечена необходимость активизации сбора материалов для увековечения памяти каждого участника войны — преподавателя, сотрудника, студента БГУ.

***Ключевые слова:*** память; Великая Отечественная война; Белорусский государственный университет; преподаватели; студенты.

# THE GREAT PATRIOTIC WAR: EVENTS AND PEOPLE IN GRATEFUL MEMORY OF THE TEACHERS AND STUDENTS OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY

**A. A. Yanousky**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, helgoleg@mail.ru*

The article systematizes numerous examples of preserving the memory of the teachers and students of the Belarusian State University – participants of the Great Patriotic War – in its daily activities from 1950 to 2025. It is noteworthy that for almost 80 post-war years, BSU has published quite a large number of books and articles about intellectual ancestors – those who fought the enemy with weapons in their hands or brought victory closer, working in the Soviet rear as teachers and scientists. At the same time, the need was noted to intensify the collection of materials to perpetuate the memory of each participant in the war – teacher, employee, student of BSU.

***Keywords:*** memory; Great Patriotic War; Belarusian State University; teachers; students.

Тэма, прымеркаваная да навуковай канферэнцыі з нагоды 80-годдзя Вялікай Перамогі, — натуральны працяг аўтарскага вывучэння шматвектарнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, неаднаразовых звяротаў да сюжэтаў удзелу выкладчыкаў і студэнтаў БДУ ў барацьбе з нямецка-фашыстскімі захопнікамі. Яшчэ на этапе працы па стварэнню экспазіцыі Музея гісторыі ўніверсітэта, у якой дамінантай сталі матэрыялы раздзела «БДУ ў гады Вялікай Айчыннай вайны», сфарміравалася асабістая перакананасць у выключнай важнасці захавання памяці аб тых, хто прынёс нам Перамогу над ворагам. Яна падмацоўвалася штодня ў сямейным асяроддзі: бацька з 1939 г. служыў у Чырвонай арміі, прайшоў «Малую зямлю», Сталінград, фарсіраванне Дняпра, узяцце Будапешта, Прагі. Вялікі ўплыў на студэнта гістфака, а потым яго супрацоўніка аказалі цесныя кантакты з настаўнікамі — прафесарамі ды дацэнтамі, якія ў большасці сваёй спазналі ваенныя выпрабаванні. Усе гады прафесійнага сталення праходзілі сярод ветэранаў Вялікай Айчыннай. Ва ўніверсітэце актыўна дзейнічала ветэранская арганізацыя. Аб ёй і аб выкладчыках і студэнтах БДУ, удзельніках барацьбы з фашызмам, 7 мая 1981 г. на канферэнцыі, прысвечанай 36-й гадавіне Перамогі, зрабіў спецыяльны даклад старшыня арганізацыі, палкоўнік-ардэнаносец, дацэнт кафедры гісторыі БССР І. В. Марчанка. Іван Васільевіч усю сваю кіпучую энергію скіроўваў не толькі на арганізацыю дзейнасці ветэранскай арганізацыі ўвогуле, але ў большай ступені на яе працу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнцтва. Тым больш, што яго кандыдацкая дысертацыя, абароненая яшчэ ў 1972 г., была прысвечана аналізу стану правядзеня такой работы ў Беларусі [1].

Пленарнае пасяджэнне пачалося ў 13:00 у аўдыторыі № 605 Галоўнага корпуса БДУ. У асабістым архіве аўтара застаўся канспект гэтага выступлення. Выступоўца згадаў, что ва ўніверсітэце налічвалася на той момант 335 ветэранаў (з іх 45 жанчын). Большасць былі франтавікамі, а 69 чалавек змагаліся ў партызанскіх атрадах і падполлі. Членамі КПСС былі 234 ветэраны. Іван Васільевіч пазначыў, што трое членаў ветэранскай арганізацыі (Дмітрый Пятровіч Жмуроўскі, Мікалай Якаўлевіч Зайцаў і Аляксандр Васільевіч Кірсанаў) — Героі Савецкага Саюза, 13 — кавалеры ордэна Леніна, 7 — ордэна Славы, 34 — ордэна Чырвонага Сцяга, 164 — ордэна Чырвонай Зоркі, 34 — ордэна Айчыннай вайны І-й ступені і 64 — ІІ-й ступені, а больш за 200 універсітэцкіх ветэранаў узнагароджаны медалямі «За отвагу», «За боевые заслуги», «Партизану Великой Отечественной войны». У абароне Масквы ўдзельнічала 47 чалавек, Ленінграда — 36, у Сталінградскай бітве — 28, у баях за Каўказ — 10, штурмавалі Кёнігсберг — 39, вызвалялі Варшаву — 34, штурмавалі Берлін — 39. Цікава было даведацца, што сярод універсітэцкіх ветэранаў на 1981 г. налічваўся 41 доктар навук, прафесар, 80 — кандыдатаў навук, 5 — членаў-карэспандэнтаў АН БССР, 13 заслужаных работнікаў адукацыі, навукі і іншых сфер дзейнасці. Увесь даклад складаўся з мноства фактаў праяўлення гераізму у баях і ў тыле прадстаўнікамі БДУ. Дакладчык выкарыстаў матэрыялы экспазіцыі Музея гісторыі БДУ, які на той час ужо 4 гады працаваў на плошчах гістфака, а таксама ўспаміны сваіх калег па ветэранскай арганізацыі.

Калі звярнуцца да першапачатковых спроб зафіксаваць гераізм і трагізм ваенных часоў у дачыненні да прадстаўнікоў БДУ, то можна згадаць кандыдацкую дысертацыю, якая была абаранена ў Маскве ў 1947 г. былым рэктарам універсітэта Парфёнам Пятровічам Савіцкім. Суіскальнік навуковай ступені кандыдата гістарычных навук прывёў шматлікія дадзеныя па наступствах для Беларусі нямецка-фашысцкай акупацыі [2]. У двух главах [глава ІІ. «Захват немцами Белоруссии и ее столицы — города Минска» і глава ІІІ. «Оккупационный режим немецких захватчиков в Белоруссии (1941–1944 гг.)»] прыведзены толькі некаторыя звесткі аб разбурэннях і стратах БДУ, панесеных за 1941–1944 гг. Праз час у некалькі іншых інтэрпрэтацыях тэма вайны і навукова-адукацыйнай сферы Беларусі гэтых гадоў і гадоў аднаўлення інтэлектуальнай працы стала даследавацца ў дысертацыйных працах і іншых беларускіх гісторыкаў [3]. Але дакладна пра БДУ ў гады вайны так і не з’явілася асобных ні дысертацый, ні манаграфій. Хіба толькі дзве сінтэтычныя кнігі, выдадзеныя да 40 і 50-годдзя ўніверсітэта, утрымлівалі на сваіх старонках асобныя эпізоды і некаторыя імёны, звязаныя з ваенным часам. Калі ў першай кнізе ў разделе «Краткий исторический очерк» гэтаму распавяданню прысвечаны ўсяго 2 старонкі [4, с. 39–40], то

ў другой у агульным гістарычным раздзеле «Этапы полувекового пути» на палову старонкі больш [5, с. 33–35]. Абедзьве кнігі былі скіраваны на прадстаўленне БДУ не праз сістэмны гістарычны агляд, а праз дзейнасць яго асобных падраздзяленняў — факультэтаў ды кафедр. Праўда, у другой кнізе выдзелены асобны вялікі раздзел пад назвай «Школа коммунистического воспитания», у якім можна знайсці не толькі прыклады накірункаў і праяў ваенна-патрыятычнага выхавання студэнтаў на той час, але і некаторыя звесткі менавіта пра БДУ і яго прадстаўнікоў у гады Вялікай Айчыннай вайны [5, с. 230–231, 234–235, 239–242]. Важна тое, што напярэдадні 25-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкай акупацыі ў дзень Перамогі 9 мая 1969 г. адбылася мемарыялізацыя подзвігу ўніверсітэцкіх выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў — пасярод універсітэцкага гарадка пад час мітынгу быў закладзены ў іх гонар адмысловы помнік. Амаль 5 тысяч сабраўшыхся прынеслі клятву вернасці памяці тых, хто «спас человечество от фашистской чумы» [5, с. 232].

Так склалася, што для аўтара ўваходжанне ў прафесію гісторыка адбылося праз дачыненне да гісторыі alma mater увогуле, а разам з тым да падзей і многіх дзесяткаў імёнаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Праца па стварэнню Музея гісторыі БДУ з вялікай, насычанай унікальнымі дакументамі і рэчамі экспазіцыяй «БДУ ў часы Вялікай Айчыннай вайны», дазволіла знайсці свой шлях у навуку. Гісторыя ўніверсітэта стала адной з галоўных навуковых парадыгм, якімі аўтар кіраваўся і кіруецца да гэтага часу. Першай жа працай у накірунку спазнання яго ваеннай гісторыі можна згадаць невялікі артыкул з аналізам зместа ваеннага раздзела ў экспазіцыі Музея гісторыі БДУ [6]. Потым, праз два гады, дадзены сюжэт быў абагулены ў кантэксце як савецкіх ідэялагем, так і разгарнуўшайся «перабудовы» [7].

Новы этап навуковых і адначасова грамадзянскіх памкненняў аўтара звязаны з шчаслівым лёсам працаваць на гістарычным факультэце БДУ ў атачэнні сапраўдных герояў Вялікай Айчыннай вайны. Хацелася б пералічыць усіх сваіх настаўнікаў, якія прайшлі дарогі вайны і дабіліся Перамогі над агалцелым ворагам. Але тады прыдзецца распавесці дакладны расказ пра кожнага з некалькіх дзесяткаў выдатных спецыялістаў (і не толькі гісторыкаў), якія працавалі на факультэце і ва ўніверсітэце ўвогуле. Гэта не аднойчы рабілася аўтарам раней, але далёка не ўсе прадстаўлены ў тых ці іншых публікацыях, а калі і прадстаўлены, то не поўна, без належнага распавядання аб суровых гадах іх жыцця. У кантэксце дадзенага артыкула выключнае ўздзеянне на фарміраванне аўтарскага светапогляду зыходзіла ад дэкана факультэта Пётра Захаравіча Савачкіна, загадчыка кафедры гісторыі БССР Лаўрэнція Сямёнавіча Абецэдарскага,

дацэнтаў кафедры гісторыі СССР Аляксея Ісаевіча Сідарэнкі, Юрыя Іосіфавіча Драгуна і асабліва — навуковага кіраўніка кандыдацкай дысертацыяй Анатоля Іосіфавіча Кажушкова.

Пасля школы А. І. Кажушкоў завочна тры гады (з 1938) вучыўся на філалагічным аддзяленні МДПІ імя А. М. Горкага, адначасова працуючы піянерважатым і настаўнікам рускай мовы і літаратуры сямігодкі. Настаўнічаў літаральна да 22 чэрвеня 1941 г., калі быў мабілізаваны. Прайшоў усю вайну ад радавога да камандзіра асобнага кулямётна-артылерыйскага батальёна. За ратныя подзвігі ўдастоены дзвюх падзяк Вярхоўнага галоўнакамандуючага, ордэнаў Чырвонай Зоркі, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны І-й і ІІ-й ступені, Кутузава ІІІ-й ступені, шасці баявых медалёў. Падчас бітваў Анатоль Іосіфавіч пяць разоў быў паранены (тры разы цяжка). Пасля вайны дэмабілізаваны гвардыі маёр, член партыі з 1945 г. каля паўгода працаваў першым сакратаром Дзяржынскага РК ЛКСМБ, а затым працягнуў вайсковую службу. Адначасова з 1952 г. завочна вучыўся на гістфаку БДУ, які з адзнакай скончыў у 1956 г. Затым завочна вучыўся ў аспірантуры (1956–1960) па кафедры гісторыі СССР і па сумяшчальніцтву стаў выкладаць. У 1962 г. Анатоль Іосіфавіч абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии во второй половине XIX века». У гэтым жа годзе дэмабілізаваўся з пасады камбата ў званні палкоўніка. Працаваў спачатку старшым выкладчыкам кафедры гісторыі СССР гістфака БДУ, а ў 1968 г. яго зацвердзілі ў вучоным званні дацэнта. У 1964–1965 гг. Анатоль Іосіфавіч працаваў намеснікам дэкана падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян, а ў 1971–1978 гг. — загадчыкам падрыхтоўчага аддзялення БДУ. На кафедры гісторыі СССР і ў БДУ ў цэлым А. І. Кажушкоў вылучаўся сваёй прынцыповасцю, меў высокі аўтарытэт, заснаваны на прафесіяналізме гісторыка, актыўным удзеле ў грамадскім жыцці і, зразумела, яго баявых заслугах.

Ён і скіраваў свайго маладога аспіранта-завочніка на спасціжэнне гісторыі БДУ ва ўсіх праявах і знакавых характарыстыках нашай alma mater. Як увогуле, так і праз выяўленне абставін ўдзелу ўніверсітэцкіх выкладчыкаў і студэнтаў у Вялікай Айчыннай вайне. Спачатку ў 1981 г. сумесна была напісана поўнавартасная гісторыя ўніверсітэта, але тыпаграфскія гранкі кнігі па суб'ектыўных прычынах (не супалі з меркаваннямі прадстаўнікоў рэктарата) раскідалі ўжо пад час яе тыражыравання (засталіся ў асабістым архіве аўтара толькі некалькі раздзелаў з пробнага экземпляра пад традыцыйнай назвай «Белорусский государственный университет имени В. И. Ленина»). Потым сумесна падрыхтавалі і апублікавалі хроніку падзей і фотаальбом за 70 год гісторыі БДУ [8; 9]. А да гэтага

Анатоль Іосіфавіч падрыхтаваў для выкарыстання ў сістэме вышэйшай і сярэдняй адукацыі адмысловую метадычную распрацоўку менавіта па сюжэтах удзелу калектыву БДУ ў падзеях Вялікай Айчыннай вайны [10]. У хуткім часе ён разам з малодшым калегам па кафедры гісторыі СССР, дацэнтам М. Ф. Чудаевым, надрукаваў артыкул і брашуру па тэме «БДУ у гады Вялікай Айчыннай вайны» [11; 12].

Што да аўтара, то пасля атрыманага ў свайго настаўніка майстар-класа пачалося самастойнае спасціжэнне таямніц універсітэцкай гісторыі, якое працягваецца па сёняшні дзень. У агульным навуковым кантэксце пастаянным інтарэсам былі і застаюцца падзеі 1941–1945 гг. у дачыненні да агульнаўніверсітэцкай праблематыкі, структурных падраздзяленняў БДУ і асабліва «людзей БДУ» — выкладчыкаў і студэнтаў. З дастаткова вялікай колькасці публікацый, якія пабачылі свет за апошнія амаль што 45 гадоў, да тых, дзе зафіксаваны ў розных сюжэтах памяць і павага да нашых інтэлектуальных прашчураў, у першую чаргу можна аднесці дзве кнігі — манаграфічнага і даведачнага зместу [13; 14]. Дакладна ўдзел навукоўцаў і студэнтаў у Вялікай Айчыннай вайне праслежаны ў аўтарскіх і калектыўных артыкулах [15; 16; 17; 18; 19; 20]. Перадваенныя, ваенныя і першыя пасляваенныя часіны ў гісторыі БДУ адлюстраваны ў некалькіх зборніках дакументаў, што пабачылі свет за апошнія 20 гадоў [21; 22; 23; 24]. Відавочны прасапаграфічны метад быў пакладзены ў аснову падрыхтоўкі юбілейнага выдання (да 100-годдзя БДУ) пяці тамоў «Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования». Гэта дало магчымасць прадставіць 132 выдатных універсітэцкіх навукоўцаў не толькі як даследчыкаў і выкладчыкаў самага высокага ўзроўню, але і праз іх удзел ў грамадска-палітычных працэсах. У тым ліку і ў Вялікай Айчыннай вайне — набліжалі Перамогу 79 асоб з 132 прадстаўленых.

Зразумела, гэты пералік адлюстроўвае не столькі здабыткі, аднаўленне памяці — індывідуальнай і карпаратыўнай, колькі пазначае неабходнасць значна больш глыбокага пранікнення даследчыкаў у шматвектарныя сюжэты велізарнай тэмы — «БДУ і яго людзі ў гады Вялікай Айчыннай вайны». Патрэбна хаця б па прашэсці 80-ці гадоў сабраць пад адну вокладку шматікія дакументальныя звесткі featured рознага паходжання, іх абагуліць, насыціць тэксты ілюстратыўным матэрыялам, прадставіць максімальна поўны спіс тых, хто змагаўся на франтах з ворагам, хто прыбліжаў перамогу ў партызанскіх атрадах, у падполлі, у тыле. Таму бачыцца неабходнасць шматтомнай калектыўнай працы прадстаўнікоў усіх падраздзяленняў цяперашняга БДУ. Невялікая кніга, якая выйшла з друку дастаткова даўно, абсалютна не можа сёння лічыцца ўвасабленнем нашай

памяці [25]. Хаця, канешне, некаторыя абставіны ваенных гадоў у сувязі з імёнамі прадстаўнікоў ўніверсітэта можна знайсці на сайце ўніверсітэта, нават у падручніках па агульнай гісторыі Беларусі Навейшага часу, а тым больш у аўтарскіх дапаможніках для студэнтаў БДУ [26].

Між тым ушанаванне памяці ўдзельнікаў вайны ва ўніверсітэце заўсёды было і застаецца прыярытэтным у кантэксце агульнай гісторыі ўстановы. Амаль кожны факультэт мае розныя публікацыі, у якіх распавядаецца аб гераічных і трагічных лёсах сваіх інтэлектуальных прашчураў. Асабліва значная пошукавая праца была праведзена на юрыдычным факультэце, дзякуючы намаганням Лідзіі Паўлаўны Максімавай [27; 28]. Яна не толькі сабрала зашмат звестак аб людзях і падзеях, сістэматызавала іх праз падачу агульнай гісторыі юрыдычнага факультэта ў сваіх кнігах, але і доўгі час была папулярызатарам памяці праз выдатны музей гісторыі юрыдычнага факультэта. Зразумела, няспынна ідзе ініцыятыўная праца даследчыкаў-гісторыкаў, увасабленнем якой з'яўляюцца як асобныя артыкулы [29], так і зборнікі па выніках навуковых канферэнцый і круглых сталоў, прысвечаных знакавым датам у кантэксце падзей Вялікай Айчыннай вайны. Тут можна спаслацца на юбілейную канферэнцыю, праведзеную гістфакам БДУ з нагоды 80-годдзя вызвалення Беларусі ад фашысцкіх акупантаў [30]. Вось толькі па-ранейшаму менавіта «універсітэцкі складнік» у агульнай ваеннай гісторыі не зусім прадстаўнічы.

У каторы раз падкрэсліўшы непрыложны факт, што БДУ з самага пачатку сваёй гісторыі быў і цяпер застаецца ўніверсітэтам класічным, патрэбна звярнуць увагу на яго міжнародныя стасункі. А яны якраз і адлюстроўваць уключанасць універсітэта Беларусі ў сусветную супольнасць. У тым ліку і ў вырашэнні агульнагуманітарных праблем, да якіх адносяцца таксама пытанні захавання гістарычнай памяці. Тут найбольш блізкім, арганічна звязаным з БДУ з'яўляецца МДУ імя М. В. Ламаносава. Аднак і іншыя ўніверсітэты Расіі ды і некаторых краін «постсавецкай прасторы» цесна супрацоўнічаюць з БДУ, таксама і ў рэчышчы захавання памяці аб Вялікай Айчыннай вайне ў самым шырокім кантэксце.

Узгадаем найбольш важныя кантакты менавіта з практыкі сумеснай працы двух гістарычных факультэтаў — БДУ і МДУ імя М. В. Ламаносава. У недалёкім часе (24 сакавіка 2014) ў Маскве паміж факультэтамі адбылося падпісанне Рабочай праграмы супрацоўніцтва на 2014–2015 гг. Гістарычны факультэт МДУ святкаваў у гэты час 80-годдзе заснавання факультэта, у якім прыняла ўдзел дэлегацыя гістарычнага факультэта БДУ. А ўжо 1–2 ліпеня 2014 г. на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ўпершыню адбыўся Міжнародны расійска-беларускі конкурс студэнцкіх навуковых работ па гісторыі «Агульны шлях да

Вялікай Перамогі: да 70-годдзя вызвалення Беларусі». Конкурс быў арганізаваны двума гістарычнымі факультэтамі. Удзельнічала каля 20 студэнтаў БДУ і МДУ. У гэтым жа годзе ў канцы кастрычніка дэлегацыя маскоўскіх гісторыкаў наведала юбілейныя ўрачыстасці з нагоды 80-годдзя заснавання гістарычнага факультэта БДУ. Падчас гэтых мерапрыемстваў 30 кастрычніка 2014 г. прайшла прэзентацыя новай манаграфіі «Фалеристика. Наградные системы мира» дэкана гістарычнага факультэта МДУ імя М. В. Ламаносава акадэміка С. П. Карпава, арганізаваная гістфакам БДУ сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай Рэспублікі Беларусь.

Затым, 15–17 чэрвеня 2015 г., у Маскве на гістарычным факультэце МДУ імя М. В. Ламаносава прайшоў Другі Міжнародны расійска-беларускі конкурс студэнцкіх навуковых работ па гісторыі «Агульны шлях да Вялікай Перамогі». Пашырылася геаграфія ўдзельнікаў конкурсу. У заключным яго этапе прынялі ўдзел 20 студэнтаў — пераможцаў завочнага тура конкурсу. Яны прадставілі не толькі гістарычныя факультэты сталічных універсітэтаў двух краін, але таксама Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова, Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, Балтыйскага федэральнага ўніверсітэта імя І. Канта. З 12 работ студэнтаў гістфака БДУ Дыпломаў 1-й ступені былі ўдастоены два трэцякурснікі, якія спецыялізаваліся па кафедры гісторыі Расіі — Ігар Курс і Алена Воднева, а дыплом 3-й ступені атрымаў яшчэ адзін «расіязнавец» — Ігар Пятровіч, які пабудаваў сваю працу на чытанні ўспамінаў аб вайне франтавікоў і партызан, якія пасля сталі супрацоўнікамі БДУ (пазней ён закончыў магістратуру МДУ). Падчас конкурсу яго ўдзельнікі наведалі Дзяржаўны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Маскоўскі Крэмль», Зброевую палату з новай выставай «Памяць аб Перамозе. Узнагароды Другой сусветнай вайны», прымеркаванай да 70-годдзя перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Наступны год у кантактах двух факультэтаў пачаўся з правядзення з 28 лютага па 4 сакавіка 2016 г. у г. Уладзімір расійска-беларускай школы маладых гісторыкаў. А 28–30 чэрвеня на гістарычным факультэце БДУ прайшоў Трэці Міжнародны расійска-беларускі конкурс студэнцкіх навуковых работ па гісторыі «Агульны шлях да Вялікай Перамогі: подзвіг народа несмяротны». Удзельнікі конкурсу наведалі Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці, Археалагічны музей «Бярэсце».

Гістарычны факультэт БДУ плённа супрацоўнічае з калегамі з Пскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Прыкладам актыўнай уключанасці студэнцтва нашых універсітэтаў у гэтае супрацоўніцтва сталі ўзаемныя дэлегацыі, якія мелі магчымасць наведаць найбольш цікавыя

славутасці Мінска і Пскова. Падчас зносін студэнтаў і выкладчыкаў узнімаліся ўзаемна цікавыя тэмы. Сярод іншых — тэма ўдзелу дзядоў і бацькоў у Другой сусветнай вайне — стала адной з ключавых. Выдатным пацвярджэннем такіх кантактаў з'яўляецца праведзеная ў 2024 г. дацэнтам Верай Васільеўнай Сяргеенкавай работа са студэнтамі першых курсаў некалькіх факультэтаў БДУ. У рамках чытання курса «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» яна прапанавала студэнтам выканаць невялікае навучальнае заданне — напісаць эсэ аб блізкіх сваяках, якія ў той ці іншай форме прымалі ўдзел у падзеях 1939–1945 гг. У выніку ж замест эсэ студэнты прадставілі паўнавартасныя нарысы з падрабязным распавяданнем аб гераізме і пакутах, аб подзвігах і цяжкіх стратах, з якіх былі вытканыя лёсы продкаў, што перанеслі жахі тых гадоў. Студэнцкія тэксты грунтуюцца на дакументах з сямейных архіваў, прачытанні рознай навуковай літаратуры. Пасля навуковай апрацоўкі гэтыя апавяданні былі аб'яднаны ў асобнай кнізе, якая ў электронным выглядзе пабачыла свет ва ўніверсітэцкім выдавецтве [31]. У кнігу ўвайшлі матэрыялы, падрыхтаваныя студэнтамі 1–4 курсаў гістарычнага, ваеннага і юрыдычнага факультэтаў БДУ падчас засваення дысцыплін «Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» і «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». Большасць з іх адлюстравалі ўспрыманне і адзнакі сучаснай моладзі подзвігу савецкага народа ў барацьбе з фашызмам. Агульная тэма раскрываецца праз канкрэтыку гісторыі сем'яў аўтараў публікацый, гісторыі гарадоў і населеных пунктаў Беларусі ў гады суровых выпрабаванняў. Паказаны генацыд беларускага народа і жахі Халакоста на тэрыторыі Беларусі. Маладыя аўтары толькі далучаюцца да напісання навуковых тэкстаў, іх выдавецкага афармлення. Але ўсе матэрыялы прасякнуты любоўю да гісторыі Радзімы, разуменнем таго, што гісторыя — гэта тое, што нас аб'ядноўвае. На Усерасійскім конкурсе «Лепшых практык захавання гістарычнай памяці», які праводзіў у Пскоўскім дзяржаўным універсітэце Нацыянальны цэнтр Гістарычнай памяці пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі (21 снежня 2024), дадзены праект у намінацыі «Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне студэнтаў» стаў Лаўрэатам.

Гісторыкі БДУ падтрымліваюць самыя цесныя адносіны з калегамі з Бранска, Іванава, Курска, Саратава, Саранска, Смаленска, Сыктыўкара, Пермі, і іншых універсітэтаў Расіі. Найцесныя сувязі са Смаленскім дзяржаўным універсітэтам, як прыклад плённага супрацоўніцтва па лініі «вялікай» навукі і навукі студэнцкай, дазволілі правесці ў Смаленску «Школу маладога гісторыка», у якой прынялі ўдзел студэнты з універсітэтаў Расіі і Беларусі. Лекцыі на актуальныя праблемы гісторыі і сучаснасці

чыталі прафесары і дацэнты з Масквы, Смаленска, Мінска. Тэма Вялікай Айчыннай вайны з'яўлялася адной з самых актуальных. Аб ваенных буднях, аб цане перамогі, аб сумесным беларуска-рускім брацтве па зброі гаварылася як у канкрэтыцы падзеі, так і былі намечаны тыя праблемы, якія патрабуюць прыкладання намаганняў вопытных і маладых гісторыкаў дзвюх краін.

Безумоўна, тэма «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа» ужо даўно арганічна ўвайшла асобным прадметам выкладання і вывучэння ў навучальныя планы большасці факультэтаў БДУ. Пачатак быў пакладзены ў адпаведнасці з лістом Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 22 снежня 2009 г. Пачынаючы з другога семестра 2009/2010 навучальнага года «у мэтах пашырэння, паглыблення і сістэматызацыі ведаў студэнтаў аб галоўных падзеях ваенных гадоў» было арганізавана чытанне курса «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)». Гэтая дысцыпліна чыталася студэнтам 1-га і 2-га курсаў усіх факультэтаў БДУ дзённай формы атрымання адукацыі ў аб'ёме 24-х лекцыйных гадзін (на другіх курсах) і 18 гадзін (на першых курсах). Студэнты ў ходзе вывучэння дысцыпліны здавалі тэсты, рыхтавалі эсэ, рэфераты, якасць падрыхтоўкі якіх улічвалася пры здачы заліку.

З 2012 г. у выніку «удасканалення арганізацыі вывучэння і аптымізацыі зместу дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла» гэты курс быў выдзелены ў інтэграваны модуль «Гісторыя» па выбары студэнта. Адпаведна, курс стаў чытацца ўжо не на ўсіх факультэтах. Напрыклад, у 2016/2017 навучальным годзе кафедра гісторыі Расіі гэты курс выкладала на гістарычным факультэце ў форме факультатыва на 1-м курсе на ўсіх спецыяльнасцях у аб'ёме 18 лекцыйных гадзін. А ў той жа час на хімічным факультэце — у аб'ёме 22-х лекцыйных і 10 гадзін семінарскіх. Кафедра кіравалася зацверджанай яшчэ ў 2010 г. тыпавой вучэбнай праграмай «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)». Асобныя навучальныя праграмы былі распрацаваны для студэнтаў усіх спецыяльнасцей гістарычнага і хімічнага факультэтаў. У працэсе выкладання курса выкарыстоўваўся шэраг кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу: тэматыка лекцый, тэматыка рэфератаў, спісы асноўнай і дадатковай літаратуры, зборнікі дакументаў, вытрымкі з мемуараў і мастацкай літаратуры, партрэтная галерэя, плакаты і ўлёткі часоў Вялікай Айчыннай вайны, карты, варыянты тэстаў, тэставыя пытанні. Студэнты наведвалі разам з выкладчыкамі курса і куратарамі навучальных груп Музей КДБ, Музей Вялікай Айчыннай вайны, Музей гісторыі БДУ і інш. Падчас чытання лекцый і правядзення семінарскіх заняткаў выкладчыкі шырока выкарыстоўвалі электронныя сродкі навучання:

дыскі з дакументальнымі фільмамі айчыннай і замежнай вытворчасці па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Другой сусветнай вайны (напрыклад, фільмы Беларускага тэлебачання аб правядзенні аперацыі «Баграціён» і вызваленні Беларусі, аб партызанскім руху; таксама фільмы Discovery: «Берлінская цытадэль Гітлера», «Баявыя аперацыі ў Венгрыі: канец 1944– пачатак 1945 г.», «Халакост».

Кафедра гісторыі Расіі забяспечвала таксама чытанне двух спецыяльных курсаў па праблематыцы Вялікай Айчыннай вайны: «Супрацьстаянне савецкай і нямецкай прапаганды на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.)» — дацэнт Г. А. Болсун; «Міжнародныя адносіны і знешняя палітыка Савецкага Саюза (1945–1965 гг.)» — дацэнт І. А. Літвіноўскі. Пры чытанні ж агульнага курса «Гісторыя Расіі і Украіны» навейшага часу на 3-м курсе гістарычнага факультэта 8 гадзін адводзілася тэмам, прысвечаным Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнам. У той час яшчэ дацэнт кафедры С. М. Цемушаў (сёння ён доктар навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў) падрыхтаваў інтэлектуальную віктарыну «Што? Дзе? Калі?» з 36 пытанняў па асноўных праблемах гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якая стала добрай падмогай для студэнтаў-практыкантаў у пазакласнай рабоце са школьнікамі падчас праходжання педагагічнай практыкі ў школах г. Мінска.

Праблематыка гісторыі Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай вайнаў знайшла сваё адлюстраванне ў навучальных і навуковых распрацоўках выкладчыкаў кафедры гісторыі Расіі. У прыватнасці, дацэнты В. В. Брыгадзіна і І. А. Літвіноўскі з'яўляюцца аўтарамі двух частак [«Міжнароднае становішча і савецкая знешняя палітыка ў пачатковы перыяд Другой сусветнай вайны» і «Савецкай грамадства і дзяржава ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945 гг.)»] навучальнага дапаможніка да агульнага курса «Гісторыя Расіі і Украіны» [32, с. 228–277]. Яны таксама напісалі раздзелы з аналізам стану сучаснай расійскай гістарыяграфіі па ваеннай праблематыцы [33, с. 42–84]. У 2010 г. у Маскве калектыў кафедры надрукаваў кнігу з падрабязным разглядам расійскай гісторыі ў Новы і Найноўшы час, дзе таксама падрабязна адлюстраваны падзеі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў [34, с. 530–558].

Пры напісанні курсавых і дыпломных работ студэнтамі гістарычнага факультэта пад кіраўніцтвам выкладчыкаў ва ўсе папярэднія гады распрацоўвалася разнастайная «ваенная тэматыка» і, вядома ж, найперш пра падзеі 1939–1945 гг. У якасці прыкладаў можна назваць такія тэмы: «Прыбалтыйскія дзяржавы ў сферы савецка-германскіх інтарэсаў (1939–1940 гг.)», «Станаўленне савецка-амерыканскага супрацоўніцтва ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень–снежань 1941 г.)», «В. І. Чуйкоў:

палкаводзец і палітычны дзеяч», «Паўсядзённае жыццё Ленінграда ў перыяд блакады (8 верасня 1941 г.–27 студзеня 1944 г.)», «Фарсіраванне Дняпра ўвосень 1943 г. Прарыў Усходняга вала», «Фарміраванне Ялцінска-Патсдамскай сістэмы міжнародных адносін (1943–1945 гг.)», «Беларуская наступальная аперацыя „Баграціён“», «Вялікая Айчынная вайна ў матэрыялах савецкага перыядычнага друку (1943–1944 гг.)», «Абарончыя бітвы Чырвонай Арміі летам 1941 г. на заходнім напрамку», «Адлюстраванне гісторыі партызанскага і падпольнага руху ў экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны» і інш. Кафедра гісторыі Расіі з'явілася ініцыятарам і арганізатарам правядзення на гістарычным факультэце (15 красавіка 2015) навукова-практычнай канферэнцыі «Памяць: вайна ў гісторыі краіны і лёсах маёй сям'і» для студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і школьнікаў, прысвечанай 70-годдзю Перамогі. У канферэнцыі прынялі ўдзел 85 чалавек.

Гісторыя Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў шмат гадоў была галоўнай у вучэбнай і навуковай дзейнасці дацэнта кафедры Галіны Аляксандраўны Болсун. Яна рэгулярна выступала на навуковых канферэнцыях і семінарах па дадзенай праблематыцы, давала інтэрв'ю тэлевізійным каналам, праводзіла на факультэце выставы найноўшай літаратуры па гісторыі войнаў, арганізоўвала сустрэчы студэнтаў з ветэранамі і былымі малалетнімі вязнямі фашысцкіх канлагераў, прымала ўдзел у рабоце Рэспубліканскага студэнцкага форума «Свет Вялікай Перамогі», чытала лекцыі для школьнікаў — «Дзіцячыя сведчанні вайны», выступала з дакладам «Выхаванне памяці на прыкладах гераізму савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў кантэксце сучасных беларуска-расійскіх адносін» на міжнароднай канферэнцыі «Российско-белорусская интеграция: от идеи к воплощению», удзельнічала ў відэабрыфінгу «Дзень Перамогі ў культуры памяці беларускага грамадства», распрацавала сцэнарый і правяла святочны канцэрт дзіцяча-юнацкага хору Усіхсвяцкага прыходу для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, малалетніх вязняў канцлагераў і беларускай грамадскасці, падрыхтавала і правяла студэнцкі дэбат-клуб «Міфалагізацыя вайны» і інш. Галіна Аляксандраўна была адным з самых актыўных і прафесіянальна падрыхтаваных папулярызатараў памяці аб Вялікай Айчыннай вайне. Але не яна адна. Сёння яе «эстафета» знаходзіцца ў руках сталых і маладых выкладчыкаў гістфака БДУ, выкладчыкаў розных кафедраў.

Такім чынам, калі азірнуцца назад, то ў каторы раз пераконваешся, што юбілейныя даты Вялікай Перамогі заўсёды дазвалялі зрушыць акцэнты менавіта на патрыятычны складнік светапогляду грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Перш за ўсё маладога, нацэленага на інтэлектуальнае

спасціжэнне мінулага, на разуменне суадносін сучаснасці з неўміручасцю подзвігу дзядоў і бацькоў. І сёння асаблівую актуальнасць мае канцэпцыя знакава-кантэкснага навучання, якая прадугледжвае шырокае выкарыстанне актыўных форм работы з моладдзю — навучанне праз дзейнасць. Гэта значыць, пры фарміраванні гістарычнай памяці аб вайне ў цэнтры ўвагі павінны быць не абстрактныя сацыялагічныя структуры, а чалавек, з яго думкамі, перажываннямі, праблемамі. У дадзеным выпадку вялікае значэнне маюць дакументы асабістага паходжання, азнаямленне з якімі студэнтаў цяжка пераацаніць. Напрыклад, узгадваючы старонкі ваеннай гісторыі БДУ і яго прадстаўнікоў, вялікі выхаваўчы патэнцыял маюць успаміны акадэміка-гісторыка М. М. Нікольскага, яго жонкі, дацэнта гістфака ўніверсітэта Р. А. Нікольскай [35, с. 7–20; 36, с. 15–27; 37, с. 97–98]. Асабліва, калі да іх дадаць прафесійныя каментары даследчыкаў [38, с. 268–275].

Імкненне разабрацца ў падзеях мінулага, зразумець іх прычыны і наступствы, скласці ўласнае ўяўленне аб вайне немагчыма без апоры на гуманістычныя каштоўнасці, усвядомленыя і прызнаныя асобай. У сувязі з гэтым мэтазгоднасць выкладання вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» у якасці абавязковай для ўсіх факультэтаў БДУ актуальна і сёння. І, магчыма, як ніколі раней у сілу сучасных геапалітычных падзей. А, галоўнае, дзеля захавання памяці аб вызначальных для сучаснасці падзей мінулага.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Марченко И. В.* Военно-патриотическое воспитание студенческой молодежи Белоруссии (1965–1970 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: спец. 07.00.02. История. СССР. Минск, 1972.

2. *Савицкий П. П.* Оккупационный режим немецких захватчиков в Белоруссии (1941–1944 гг.): дис. … канд. ист. наук. М.: Академия общественных наук при ЦК ВКП(б), 1947.

3. *Кованцева Г. М.* Восстановление и развитие высшей школы Советской Белоруссии в 1943–1950 годы: дис. … канд. ист. наук. Минск, 1955.

4. Белорусский государственный университет имени В. И. Ленина / отв. ред. Л. С. Абецедарский. Минск: Изд-во МВССПО БССР, 1962. 279 с.

5. Белорусский государственный университет имени В. И. Ленина / редактор-составитель А. И. Кожушков. Минск: Изд-во БГУ имени В. И. Ленина, 1971. 319 с.

6. *Яновский О. А.* Тема Великой Отечественной войны в экспозиции музея истории Белорусского государственного университета имени В. И. Ленина // Героические события Великой Отечественной войны в памятниках и обелисках Родины и их роль в военно-патриотическом воспитании молодежи: Тезисы межвуз. науч.-практ. конф. Минск: Полымя, 1985. С. 30–32.

7. *Яновский О. А.* Музей вуза — пропагандист боевых и трудовых традиций, действенная форма коммунистического воспитания будущих специалистов // Всесоюзная научная конференция по историческому краеведению. Тезисы докладов и сообщений. Киев, 1987. С. 200–201.

8. *Кожушков А. И.*, *Яновский О. А.* Белорусский университет. Хроника событий (1919–1989). Минск: БГУ, 1990. 238 с.

9. *Кажушкоў А. І.*, *Вараб'ёў В. П.*, *Яноўскі А. А.* Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна. Мінск: Асацыяцыя «АЖУР» СЖБ, 1991. 96 с.

10. *Кожушков А. И.* Белорусский государственный университет имени В. И. Ленина в годы Великой Отечественной войны: методическая разработка для преподавателей. Минск: БГУ, 1984. 17 с.

11. *Кожушков А. И.*, *Чудаев М. Ф.* За честь и независимость родины (Участие преподавателей и студентов БГУ в борьбе с немецко-фашистскими захватчиками в годы Великой Отечественной войны) // Веснік БДУ імя У. І. Леніна. Серыя III. Гісторыя. Філасофія. Навуковы камунізм. Эканоміка. Права. 1984. № 2. С. 5–7.

12. *Кожушков А. И.*, *Чудаев М. Ф.* Белорусский государственный университет имени В. И. Ленина в годы Великой Отечественной войны. Минск: БГУ, 1984. 19 с.

13. *Яноўскі А. А.*, *Зельскі А. Г.* Гісторыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў біяграфіях яго рэктараў. Мінск: БДУ, 2001. 320 с.

14. Прафесары і дактары навук Беларускага дзяржаўнага універсітэта / Аўт.-скл. А. А. Яноўскі. Мінск: БДУ, 2001. 339 с.

15. *Яновский О. А.*, *Яновская В. В.* Попытки нового прочтения белорусской истории накануне и в годы Великой Отечественной войны // Вторая мировая война в истории человечества. 1939–1945 гг.: материалы междунар. науч. конф. М.: Издатель Степаненко, 2015. 728 с.

16. *Яновский О. А.*, *Прохоров А. А.*, *Ходин С. Н.* 21-й учебный год Белорусского университета — возрождение в условиях Великой Отечественной войны // Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. X. Минск: БГУ, 2015. С. 9–30.

17. *Яноўскі А. А.* Змагацца ці выжываць? Лёсы беларускіх інтэлектуалаў ва ўмовах Другой сусветнай вайны // Гуманітарна-эканамічны веснік. 2016. № 1–2. С. 10–16.

18. *Яноўскі А. А.* Войны 1939–1945 гг. у лёсах інтэлектуалаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта // Пичетовские чтения — 2020: войны в истории человечества. К 75-летию Победы над фашизмом: материалы междунар. науч. конф. Минск: БГУ, 2020. С. 46–53.

19. *Яновский О. А.* Россиеведы Белорусского государственного университета — участники Великой Отечественной войны // Актуальные проблемы исследований истории России и Белоруссии (к 80-летию Курской битвы): материалы междунар. научно-практ. конф. Курск: Изд-во КГУ, 2024. С. 9–18.

20. *Гернович Т. Д.*, *Шумейко М. Ф.*, *Яновский О. А.* Сохранение памяти о Великой Отечественной войне через цифровые технологии: методика создания цифровой выставки «Белорусский государственный университет в годы Великой Отечественной войны» и ее образовательное значение // Великая Отечественная война в судьбе белорусского народа: материалы международной научно-практической конференции, посвященной 80-летию проведения Белорусской стратегической наступательной операции «Багратион» и освобождения Беларуси / редкол.: А. Г. Кохановский (гл. ред.) [и др.]. Минск: БГУ, 2024. С. 5–12.

21. Памяць і слава: Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1921–1941 / Аўт.-склад.: А. А. Яноўскі, М. Ф. Шумейка, С. М. Ходзін. Мінск: БДУ, 2006. 383 с.

22. Памяць і слава: Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1945–1961 / склад.: С. М. Ходзін, М. Ф. Шумейка, А. А. Яноўскі. Мінск: БДУ, 2009. 405 с.

23. Памяць і слава: Першы рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта — Уладзімір Іванавіч Пічэта / склад.: С. М. Ходзін, М. Ф. Шумейка, А. А. Яноўскі. Мінск: БДУ, 2011. 375 с.

24. Неизвестный В. И. Пичета / сост., предисл., примеч. М. Ф. Шумейко, В. В. Яновская, О. А. Яновский. Минск: БГУ, 2021. 436 с.

25. Памяць і слава: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт у гады Вялікай Айчыннай вайны, 1941–1945 / склад.: С. А. Балашэнка [і інш.]. Мінск: БДУ, 2005. 151 с.

26. Беларусь у перыяд Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны 1939–1945 гг.: дакументы і матэрыялы: вучэбны дапаможнік / уклад. А. І. Котаў. Мінск: БДУ, 2004. 167 с.

27. *Максимова Л. П.* Alma mater юристов Беларуси: История и современность юридического факультета БГУ. Минск: Право и экономика, 2001. 171 с.

28. *Максимова Л. П.* Юридический факультет Белорусского государственного университета: История и современность. Минск: БГУ, 1998. 199 с.

29. *Хадасевич А. С.* Белорусский государственный университет в годы Великой Отечественной войны // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць. Вып. 18: матэрыялы [XVIII] міжнар. навук. канф. Мінск: МГЛУ, 2020. С. 110–114.

30. Великая Отечественная война в судьбе белорусского народа: материалы международной научно-практической конференции, посвященной 80-летию проведения Белорусской стратегической наступательной операции «Багратион» и освобождения Беларуси / редкол.: А. Г. Кохановский (гл. ред.) [и др.]. Минск: БГУ, 2024. 397 с.

31. Вспомним всех: студенты Белорусского государственного университета о Великой Отечественной войне (к 80-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков): сборник материалов / отв. ред.: В. В. Сергеенкова, О. А. Яновский. Минск: БГУ, 2024. 281 с.

32. История России. XX век: Учебное пособие / под ред. В. И. Меньковского и О. А. Яновского. Минск: РИВШ, 2005. 704 с.

33. Современная российская историография. В 2-х ч. Ч. 2 / под ред. В. И. Меньковского. Минск: РИВШ, 2009. 274 с.

34. История России: Новое и Новейшее время / под общей науч. ред. проф. О. А. Яновского. М.: Эксмо, 2010. 784 с.

35. *Никольский Н. М.* Как мы ушли к партизанам // Рукописный журнал «Партизан Отечественной войны» за февраль 1944 г. партизанского отряда имени С. Г. Лазо бригады «За Советскую Белоруссию» Минской области, хранящийся в Белорусском государственном музее истории Великой Отечественной войны. Фонды кп. 13264.

36. Рукопись с воспоминаниями Р. А. Никольской о пережитом // Из личного архива О. А. Яновского.

37. *Никольская Р. А.* Живу исключительно любовью // The Health Magazine Здоровье. Декабрь. Вашингтон, 2003.

38. *Гуленко В. И.*, *Шумейко М. Ф.* «Как мы пришли к партизанам» (воспоминания Н. М. Никольского) // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навуковы зборнік. Вып. 3. Мінск: БДУ, 2008. С. 155–165.